■ Жыць прыгожа

ХТО ПЕРАШКАДЖАЕ БЕЛАРУСАМ БЫЦЬ МОДНЫМІ?

Суб'ектыўныя развагі пасля Беларускага тыдня моды

Сёмы сезон Belarus Fashion Week by Marko не толькі парадаваў публіку мноствам цікавых рашэнняў, якія ўжо заўтра будуць супермоднымі, і паказаў, што айчынным дызайнерам ёсць куды расці, але і даў нагоду для роздуму.

ДЗЕ ТАЛІЮ РАБІЦЬ БУДЗЕМ?

Наступную вясну і лета беларускія мадэльеры прапануюць сустракаць ва ўсім як мага больш натуральным і блізкім да прыроды. Лён, бавоўна, шоўк, кашмір прыродных колераў — пясочнага, зялёнага, бірузовага, валошкавага, шакаладнага, фіялкавага, пунсовага, вішнёвага, сонечнага жоўтага — як прыглушаных, спакойных, так і смелых, нават дзёрзкіх, ва ўсемагчымых камбінацыях з класічнымі чорным, белым і шэрым; ручная афарбоўка, яркія прынты, скураныя і вязаныя элементы — усё гэта абяцае быць модным. Гарадскі стыль спалучае рамантычную ўзнёсласць і прадуманую практычнасць, знарочыстую нядбайнасць папулярнага «піжамнага» стылю і стрыманую элегантнасць класікі. Многія мадэлі прадугледжваюць, што ў гэткім уборы можна ранкам пайсці на працу, а вечарам — «у свет», не губляючы час на пераапрананне.

Практычна ўсе айчынныя дызайнеры пішуць свае прозвішчы лацінкай і прыдумляюць брэндам прыгожыя назвы на «еўрапейскі лад» — на англійскай, французскай, латыні, але толькі не на роднай мове...

Мужчынскіх мадэляў на паказах 7-га сезона BFW by Marko было няшмат, але тыя, што былі, выклікалі бурныя апладысменты і гарачыя абмеркаванні ў кулуарах. Каб быць у трэндзе, дызайнеры прапануюць беларусам налета прытрымлівацца трох «не»: не галіцца, пакінуўшы сабе карсарскую бараду, не баяцца яркіх фарбаў і не ахвяраваць уласнай індывідуальнасцю на карысць мілфічнай «грамадскай думкі».

ВЕШАЦЬ НЯМА КУДЫ, А НАСІЦЬ НЯМА ЧАГО

Першая і, бадай, галоўная выснова беларускага моднага тыдня аптымістычная: мода ў Беларусі была, ёсць і працягвае развівацца. Зразумела, нам далёка да Міланскага моднага тыдня. Дый глупства гэта, як справядліва заўважыла кіраўнік аргкамітэта BFW, старшыня Беларускай палаты моды Яніна Ганчарова, — у 7-гадовым «пяшчотным» узросце спаборнічаць з гульцом славутай «моднай чацвёркі», які ладзіць модныя паказы ўжо 55 гадоў (!). «Безумоўна, ёсць куды расці і развівацца, мы толькі на пачатку шляху. Магчыма, нам нестае глянцу, але яго не хапае, напэўна, і ў краіне, і ў нас саміх. З іншага боку, калі пачынаўся Міланскі тыдзень моды, яшчэ не было інтэрнэту, fashion-блогераў, сацыяльных сетак, баераў і г.д., так што нам у пэўным сэнсе лягчэй», — дадае Яніна Ганчарова. Больш за тое, нават ёсць чым ганарыцца: некаторыя формы, напрацаваныя беларусамі, з поспехам выкарыстоўваюцца на іншых тыднях моды — скажам, асобна арганізаваны паказ дзіцячай моды альбо паказы дзяржпрадпрыемстваў, якія ўваходзяць у канцэрн лёгкай прамысловасці.

Сёння ў Беларускага тыдня моды ўжо ёсць дастаткова сур'ёзныя партнёры з ліку моцных, паспяховых кампаній, наладжаны карысныя ў сэнсе абмену вопытам кантакты з іншымі тыднямі моды — ад сталых да вельмі маладых, ёсць запатрабаваны конкурс маладых дызайнераў з 5-гадовай гісторыяй, ёсць сваё кола моднай публікі, прэсы, крытыкаў і ўласна ўдзельнікаў=мадэльераў.

Я зусім не агітую за тое, каб на наступным Беларускім тыдні моды ўдзельнікі выкарыстоўвалі спрэс слуцкія паясы, радзівілаўскія карункі і народную вышыванку. Аднак павага да беларускага мусіць быць з абодвух бакоў.

З іншага боку, паўстае ў памяці выраз правадыра сусветнага пралетарыяту: «Вузкае кола гэтых рэвалюцыянераў, страшна далёкія яны ад народа». І гэта другое ўражанне ад Belarus Fashion Week by Marko: як быццам модны тыдзень — сам па сабе, канчатковыя спажыўцы — самі па сабе. Не ведаю, чаму так. Можа, таму, што ў сталічных крамах кошт модных касцюмаў, пашытых камандай Беларускага цэнтра моды, складае ў сярэднім 20% і больш ад сярэднебеларускага заробку? Ці таму, што большасць прадстаўленых на подыуме мадэляў адзення ў прынцыпе не даходзіць да масавай вытворчасці — вопытным канструктарам проста немагчыма ўявіць, куды гэта можна апрануць? Альбо таму, што дызайнеры па-ранейшаму арыентуюцца на маладзенькіх дзяўчат і юнакоў і памеры 42-44, а суайчыннікам, хто мае 50-ы і большыя, даводзіцца выбіраць не з моднага, а з таго, што наогул удаецца знайсці?..

Паўстае ў памяці выраз правадыра сусветнага пралетарыяту: «Вузкае кола гэтых рэвалюцыянераў, страшна далёкія яны ад народа». І гэта другое ўражанне ад Belarus Fashion Week by Marko: як быццам модны тыдзень — сам па сабе, канчатковыя спажыўцы — самі па сабе.

ЛЮБІЦЬ СВАІХ. АЛЕ ТОЛЬКІ ЎЗАЕМНА

Мы не прывыклі надта высока цаніць сваё, якой бы сферы гэта ні датычылася. Безумоўна, людзей творчых такое стаўленне, мякка кажучы, расхаладжвае. Нярэдка на радзіме фанфары на адрас таго ці іншага беларуса гучаць толькі пасля таго, як яго талент прызнаюць у іншай краіне. Яскравы прыклад з моднай галіны — пераможца аднаго з сезонаў амерыканскага шоу «Подыум» Дзмітрый Шолахаў. Таму і заклікаюць арганізатары Беларускага тыдня моды вітаць новыя таленты ўжо цяпер — хадзіць на паказы, аказваць інфармацыйную падтрымку, заўважаць і ацэньваць прафесійныя праграмы, у якіх здолелі б паўдзельнічаць як мага больш зацікаўленых людзей, а мы прывозілі б сюды адмыслоўцаў з галіны моды, лектараў, у якіх ёсць чаму павучыцца. Трэба разумець, што мы не ставім сабе за мэту зрабіць шоу: прывезці некалькі вядомых брэндаў і прадэманстраваць іх бліскучыя калекцыі. Мы імкнёмся стаць бліжэй да спажыўцоў, а гэта для кожнага дызайнера, для кожнага брэнда — вялікая праца і падбор інструментаў, якія ім найбольш падыходзяць.

І гэта ўсё, у прынцыпе, правільна, але... Зірнем на другі бок медаля. Напрыклад, каманда з трох дызайнераў Беларускага цэнтра моды прадставіла на гэтым BFW сваю новую льняную вяснова-летнюю калекцыю з трох «капсул» — пад назвамі «Freedom», «Riviera» і «Ускользающий день». Падкрэслім — гэта беларускія дызайнеры вядучага айчыннага брэнда, які мусіць рухаць беларускую моду, прапануюць суайчыннікам пранікнуцца духам Рыўеры і гэтак далей. А чаму не прыгажосцю і чысцінёй Браслаўскіх азёраў, веліччу Белавежскай пушчы, паводкай на «беларускай Амазонцы» — Прыпяці? Не, я зусім не агітую за тое, каб на наступным Беларускім тыдні моды ўдзельнікі выкарыстоўвалі спрэс слуцкія паясы, радзівілаўскія карункі і народную вышыванку. Аднак павага да беларускага мусіць быць з абодвух бакоў. І той факт, што з усіх удзельнікаў сёлетняга тыдня хіба адна дызайнер Зіна Фядзюніна дала сваёй калекцыі беларускамоўную назву «Асабісты погляд» — на мой погляд, красамоўны. Як і такі момант, што практычна ўсе айчынныя дызайнеры пішуць свае прозвішчы лацінкай і прыдумляюць брэндам прыгожыя назвы на «еўрапейскі лад» — на англійскай, французскай, латыні, але толькі не на роднай мове... Дробязь? Магчыма. Але менавіта з падобных дробязяў пачынаецца любоў да свайго. Хіба не?

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.
Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ і з афіцыйнага сайта конкурсу www.bfw.by

---

Крынічка

«Цякла тут з лесу невялічка
Травой заросшая крынічка».
Якуб КОЛАС.

Вядучая рубрыкі Ірына ТАМКОВІЧ. № 32 (490)

Сакрэты садаводаў

✓Пры пасадцы вішань і сліў уносіць гной у пасадачную яму неабавязкова. Значна больш карысці будзе ад унясення драўнянага попелу, касцявой мукі, старой вапны, перапаленай гліны або бітай тынкоўкі. У занадта ўрадлівай, «тлустай» зямлі вішні і слівы пачынаюць хварэць, у іх лопаецца кара і выцякае камедзь. Плоданашэнне ад гэтага зніжаецца. І вішні, і слівы не любяць абрэзкі кроны, пераносяць яе даволі хваравіта. Таму рэкамендуецца фарміраваць крону адразу пры пасадцы саджанцаў. Ад бакавых галін пакідаюць прыкладна па 1/3 даўжыні, цэнтральныя парасткі кароцяць напалову ці крыху менш. У наступныя гады дапушчальна толькі выдаленне падмерзлых парасткаў.

✓Маліна вельмі патрабавальная да ўгнаенняў. Увесну карысна падрыхліць пад ёй глебу і замульчыраваць тоўстым слоем перапрэлай арганікі. На працягу лета можна 2-3 разы падкарміць яе вадкімі арганічнымі або мінеральнымі ўгнаеннямі: першы раз — перад цвіценнем, другі — на пачатку ўтварэння завязяў. Адразу ж пасля завяршэння перыяду плоданашэння старыя парасткі трэба выразаць пад корань і правесці трэцюю падкормку для маладых парасткаў, якая набіраюцца сіл для будучага ўраджаю.

Незвычайная гародніна і садавіна

Фіялетавая бульба

Нікога не здзівіш бульбачкай з жоўтай, ружовай ці нават фіялетавай лупінай. Але вось бульбачка, фіялетавая ўсярэдзіне, — гэта штосьці новае. Яе з'яўленню мы абавязаны навукоўцам з Colorado State University, якія доўга працавалі над бульбай з андскіх высакагор'яў, пакуль не атрымалі знакаміты фіялетавы колер. Гэтым насычаным колерам бульбачка абавязана высокай колькасці антацыянаў, якія валодаюць антыаксідантнымі ўласцівасцямі якія, дарэчы, захоўваюцца пасля прыгатавання. Больш за ўсё бульбе гатунку «Фіялетавая вялікасць», які шырока прадаецца ў Англіі, падыходзіць клімат Шатландыі, дзе яе зараз і вырошчваюць. На смак фіялетавая бульбачка не адрозніваецца ад звычайнай.

Брокаліні

Складана паверыць, што брусельская і савойская капуста, брокалі і кальрабі — сваякі. Нядаўна ў капусным шэрагу здарыўся прыбытак. У выніку скрыжавання звычайнай брокалі і гародніны гайлан (кітайская брокалі) атрымалася расліна, падобная на спаржу з галоўкай брокалі на верхавіне. Брокаліні не мае рэзкага капуснага паху, трохі саладкавая, з перачнай ноткай, далікатная на смак, нагадвае брокалі і спаржу адначасова. Новая гародніна нізкакаларыйная і змяшчае шмат карысных рэчываў. У ЗША, Іспаніі, Бразіліі, краінах Азіі брокаліні — звыклы гарнір. Звычайна яе або злёгку абсмажваюць у алеі або падаюць свежай, палітай алеем.

Пясок, гліна, суглінак

Каб атрымліваць высокія ўраджаі і больш эфектыўна выкарыстоўваць ўгнаенні, кожны садоўнік або агароднік павінен ведаць, якая глеба ў яго на ўчастку.

Паводле механічнага саставу (утрыманне ў ёй гліністых крупінак) глебы падзяляюцца на пяскі, супескі, лёгкія, сярэднія і цяжкія суглінкі, а таксама на лёгкія, сярэднія і цяжкія гліны. Пры гэтым некаторыя агароднікі памылкова спрабуюць вызначаць тып глебы па яе колеры. Пры такой ацэнцы супесак часта прымаюць за суглінак, а суглінак — за гліну.

Звязана гэта з тым, што колер глебы і яе адценні залежаць не толькі ад колькасці гліны, але і ад яе мінералагічнага саставу. Таму механічны састаў глебы неабходна вызначаць па ступені яе звязнасці.

Для палявых умоў існуе методыка вызначэння саставу глебы, якая не патрабуе ніякіх інструментаў і даступная ўсім. Па гэтым метадзе, які называюць «мокрым», узор глебы ўвільгатняюць і змешваюць да цестападобнага стану. З падрыхтаванай глебы на далоні скочваюць шарык і спрабуюць раскачаць яго ў шнур («каўбаску») таўшчынёй каля 3 мм ці крыху больш, затым скруцяць у кольца дыяметрам 2-3 см.

Пясок не ўтварае ні шарыка, ні шнура.

Супесак утварае шарык, які раскачаць у шнур («каўбаску») немагчыма.

Лёгкі суглінак утварае шнур, які можна згарнуць у кольца, але яно атрымліваецца вельмі нетрывалым і лёгка распадаецца на часткі пры спробе ўзяць яго ў рукі. Сярэдні суглінак утварае суцэльны шнур, які скручваецца ў кольца, але яно будзе з расколінамі і пераломамі. Цяжкі суглінак лёгка раскочваецца ў шнур. Кольца атрымліваецца з расколінамі.

Гліну можна скруціць у доўгі тонкі шнур, з якога атрымліваецца кольца без расколін.

Пясчаныя глебы складаюцца з незлічоных пясчаных крупінак, дзякуючы якім вада прасочваецца, як праз рэшата. Яны бедныя на пажыўныя рэчывы. Затое награваюцца хутка, але так жа хутка і астываюць. Іх лёгка апрацоўваць. На пясчаных землях расліны звычайна пакутуюць ад «недаядання» і недахопу вады. Вось чаму такія глебы неабходна ўзбагачаць перагноем і рэчывамі, якія злучаюць, — кампостам і парашком торфу. Пясчаныя глебы звычайна маюць невялікі прымешак гліны.

Наступны тып глебы — суглінкі. Яны ў стане назапашваць ваду, пажыўныя рэчывы і добра акумуляваць і захоўваць цяпло. Да таго ж змяшчаюць кальцый, неабходны для падтрымання нармальнай кіслотнасці глебы. Суглінкавыя глебы ўраджайныя. У залежнасці ад суадносін пяску і арганікі яны могуць быць рыхлыя, гумусныя або гладкія, цяжкія. Суглінкі трэба пастаянна забяспечваць кампостам і пакрываць мульчой.

Структура гліністых глебаў цяжкая і шчыльная. Яны воданепранікальныя і сырыя. Корань з цяжкасцю пранікае ў гэтую глейкую і вільготную масу. Пры дажджы на глінах застойваецца вада, а ў засуху зямля робіцца цвёрдай, як цэгла. Гліністая глеба ў сваёй аснове ўрадлівая, калі акультурыць і забяспечыць пажыўнымі рэчывамі. Пры гэтым увесь час трэба паляпшаць яе структуру. Часта гэта даволі працаёмкі занятак: пры рыхленні падмешваць пясок (40 кг на 1 м²) з унясеннем арганічных угнаенняў (10 кг на тую ж плошчу). Дапамагае і зеляніна, вырашчаная на глінах для заворвання. Глыбока пранікальныя карані ўтвараюць пустоты, запоўненыя паветрам. Кампосты і мульча паступова ўтвораць багаты перагноем паверхневы слой — крыніцу ўраджайнай сілы зямлі.

Калі вы можаце вызначыць від глебы па механічным саставе і яе ўласцівасці, то зможаце вырашыць, калі, колькі і чаго ўносіць. Арганічныя ўгнаенні на параўнальна лёгкіх глебах трэба ўносіць меншымі дозамі (прыкладна па 4 кг/м²), але часцей, а на цяжкіх глебах гной уносяць радзей, але колькасць яго павялічваюць (да 8 кг/м²).

Даты Падзеі Людзі

1812 год — нарадзіўся (вёска Крошын, цяпер Баранавіцкі раён) Паўлюк Багрым (Павел Восіпавіч Багрым), беларускі паэт. За распаўсюджванне антыпрыгонніцкіх вершаў быў здадзены ў рэкруты (праўда, гэта дакументальна не пацверджана). Працаваў у Крошыне кавалём. Да нашых дзён захаваўся толькі адзін верш — «Зайграй, зайграй, хлопча малы», шэдэўр беларускай лірыкі XIX ст. У Крошынскім касцёле захоўваецца металічная жырандоля работы Багрыма — узор мастацкага кавання. Памёр у 1891 годзе. У 1985-м у Крашыне адкрыты музей народнага мастацтва і рамёстваў імя Багрыма.

1840 год — нарадзіўся славуты французскі жывапісец Клод Манэ. Калі кажуць, што імпрэсіяністы ўмелі захаваць «момант няспыннага руху жыцця», то, перш за ўсё, маюць на ўвазе карціну Манэ «Бульвар Капуцынак у Парыжы». Аднак гэтая карціна, паказаная на Першай выставе імпрэсіяністаў, стала адной з тых, якія выклікалі найбольш насмешак і нападак публікі і прэсы.

1933 год — нарадзіўся (вёска Ніўкі Чачэрскага раёна) Вацлаў Юльянавіч Мінько, беларускі вучоны ў галіне геадэзіі, доктар тэхнічных навук (1993). Аўтар навуковых прац па геадэзіі і фотатапаграфіі.

Было сказана

Андрэй ВОЛЯН, філосаф, ідэолаг Рэфармацыі:

«Законы — глухія і няўмольныя. З іх больш карысці слабому, а не моцнаму».

■ Замор'е

ГУЛЯЦЬ З САБАКАМ — ДА ГРОШАЙ!

Англічанін, які выгульваў сабаку на марскім беразе, не думаў, што чарговая знаходка хатняга гадаванца зможа значна папоўніць фінансавую скарбонку. 50-гадовы Кен Уілман гуляў па пляжы горада Моркама ў графстве Ланкашыр, калі яго баксёр Мадж пачаў моцна брахаць на вялікі камень. Падышоўшы да валуна бліжэй, Уілман пагрэбаваў яго чапаць, бо пах, які ішоў ад знаходкі, быў невыносным.

Аднак, прыйшоўшы дадому, Уілман перш за ўсё зайшоў у інтэрнэт у пошуках інфармацыі пра знаходку. Высветлілася, што пакінутая ім без увагі глыба ўяўляе сабой амбру — рэчыва, якое ўтвараецца ў стрававальным тракце кашалотаў, а затым выводзіцца з арганізма ў выглядзе камянёў. Амбра высока цэніцца парфумерамі, бо яе дадаюць у састаў самых дарагіх духоў. Яе пах, спачатку непрыемны, з часам акультурваецца і робіцца падобным на мускусны. А выкарыстоўваюць гэтае рэчыва як фіксатар паху, паколькі амбра доўга ўтрымлівае лятучыя духмяныя рэчывы на скуры.

Уілман, усвядоміўшы, што зрабіў недаравальную памылку, кінуўся на бераг і, на шчасце, знайшоў камень на месцы. Мужчына аднёс яго дадому, выставіў у інтэрнэце на продаж і ўжо атрымаў першыя прапановы аб куплі. «Французскі дылер прапанаваў мне 5 тысяч еўра за 300 грамаў, і з улікам таго, што мая амбра важыць тры кілаграмы, атрымліваецца немаленькая сума — 50 тысяч», — распавёў брытанец. «Эксперты, з якімі я кансультаваўся, сказалі, што за гэтае рэчыва ў Швейцарыі можна атрымаць у чатыры разы больш», — разважае Уілман, які не перастае здзіўляцца, што камень стане для яго «мяшком з грашыма». А Маджа, які знайшоў скарб, ён з таго часу корміць толькі яго любімымі сасіскамі.

АДЗЕННЕ, ЯКОЕ ВЫДАЕ ГАСПАДАРОЎ

Галандскі мадэльер-наватар Даан Разегардэ стварыў сукенку, якая становіцца празрыстай, калі яе ўладальніца адчувае сексуальнае ўзбуджэнне. Непразрыстай застаецца толькі ніжняя частка сукенкі, пакрытая фольгай. Верхняя ж частка са скуры і так званых «электронных пласцінак», якая прыкрывае грудзі, можа раптам перастаць хаваць цела жанчыны. Гэтая сукенка атрымала назву Intimacy.

Строй, створаны з адмысловага матэрыялу, здольнага змяняць колер у залежнасці ад настрою чалавека. Аналагічны прынцып быў выкарыстаны ў некалі папулярных пярсцёнках-хамелеонах.

Як толькі сэрца ўладальніцы сукенкі пачынае біцца хутчэй, тая імкліва становіцца празрыстай.

Стваральнік сукенкі перакананы, што Intimacy — гэта сапраўдны тэхналагічны прарыў. Сёння вынаходка існуе ў некалькіх эксперыментальных асобніках. У дызайнера вялікія планы: для пачатку запусціць паўнавартасную лінію адзення, а затым дапоўніць яе ніжняй бялізнай. Зрэшты, вянцом творэння павінен стаць мужчынскі касцюм, які будзе мяняць колер, калі яго ўладальнік хлусіць. Што і казаць, мара многіх дзяўчат, ды і, можа, нават больш, замужніх жанчын. Сукенкі Intimacy былі прадстаўлены сёлета на выставах у Парыжы, Ганконгу і нядаўна ў ЗША.

Падрыхтаваў Іван КУПАРВАС

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск	8.35	17.12	8.37
Віцебск	8.30	16.57	8.27
Магілёў	8.25	17.02	8.37
Гомель	8.16	17.05	8.49
Гродна	8.49	17.29	8.40
Брэст	8.44	17.35	8.51

Месяц

Поўня 17 лістапада.
Месяц у сузор'і Авена.

Імяніны

Пр. *Ульяны, Аляксандра, Дзмітрыя, Дзям'яна, Івана, Кузьмы, Сяргея, Фёдара, Якава.*
К. *Андрэя, Лаўрэнція, Уладзіміра, Юзафа.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЗАЎТРА



УСМІХНЕМСЯ

Жонка ў камандзіроўцы, тэлефануе мужу:

— Ты як там? З бабамі не гуляеш?

— Што ты!

— А посуд хоць мыеш?

— Ну вось яшчэ — у гасцях мне посуд не хапала мыць!

Пачаты выпуск украінскага аналагу лялькі Барбі — Аксаны.

У камплект уваходзяць: яе сябар Мікола, хата, летняя кухня, два гектары агарода, рыдлёўка, граблі, атрута для каларадскіх жукоў.

Што вы будзеце рабіць, калі ўбачыце зялёнага чалавечка?

60% — кіну піць!

30% — пачну піць!

9% — пайду на прыём да псіхіятра!

І толькі адна дзяўчына сказала: «Пачну пераходзіць дарогу».

caricatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н.КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), В. КЛЮЧНІК (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, С. ПРОТАС (першы намеснік дырэктара), Н. РАСОЛЬКА, С.РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

НАШ АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 38, 287 17 21, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Магілёве: 32 74 31, па Мінскай вобл.: (017) 292 21 03; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by,
(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009.

220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.

Тыраж 22.434. Індэкс 63850. Зак. № 4969.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 13 лістапада 2013 года.